УДК 82.0:82-1/-9:115:316.7

**А. В. Цімашэнка**
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, White_Land@mail.ru

# КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ ЛІМІНАЛЬНАГА ХРАНАТОПА Ў СУЧАСНЫМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ

У артыкуле канцэптуалізуецца паняцце «лімінальны хранатоп» як фундаментальная анталагічная катэгорыя сучаснага літаратуразнаўства. Адыходзячы ад традыцыйнага дэскрыптыўнага разумення прасторава-часавых каардынат, аўтар вызначае дадзены феномен як аўтаномную інтэрстыцыяльную матрыцу мастацкага быцця. Гэтая матрыца забяспечвае стан анталагічнай прыпыненасці, у якім трансгрэсія суб'ектнасці і семіятычная дыфузія межаў становяцца асноўнымі сістэмаўтваральнымі прынцыпамі паэтыкі. У працы даследуецца працэсуальнасць лімінальнага хранатопа як зоны радыкальнай дэканструкцыі фіксаваных ідэнтычнасцей, у якой адбываецца якасная мутацыя мастацкага кантынууму. Распрацаваная тэарэтычная парадыгма дазваляе стварыць эфектыўную метадалогію інтэрпрэтацыі сучасных тэкстаў, якія адлюстроўваюць глабальны крызіс класічнай антрапалагічнай парадыгмы і распад метанаратываў. Увядзенне дадзенай катэгорыі істотна мадыфікуе метадалагічны апарат тэарэтычнай паэтыкі, забяспечваючы эўрыстычны прарыў у даследаванні складанай наратыўнай дынамікі сучасных мастацкіх сістэм.

**Ключавыя словы:** лімінальнасць; ініцыяцыя; трансгрэсія; сучасная літаратура; лімінальны хранатоп; аб'екцыя; гетэратопія; трансфармацыя; гіперрэальнасць; сімулякр; сімуляцыя; постструктуралізм.
Бібліягр.: 11 назваў.

**A. V. Tsimashenka**
State Scientific Institution "Belarusian Culture, Language and Literature Research Center of the National Academy of Sciences of Belarus", 1 Surganova Str., build. 2, 220072 Minsk, the Republic of Belarus, White_Land@mail.ru

# THE LIMINAL CHRONOTOPE CONCEPTUALIZATION IN CONTEMPORARY LITERARY STUDIES

The article conceptualizes the notion of the "liminal chronotope" as a fundamental ontological category of contemporary literary studies. Moving away from the traditional descriptive understanding of spatiotemporal coordinates, the author defines this phenomenon as an autonomous interstitial of artistic being matrix. This matrix ensures a state of ontological suspension, in which the transgression of subjectivity and the semiotic diffusion of boundaries become the primary system-forming principles of poetics. The work investigates the processuality of the liminal chronotope as a zone of radical deconstruction of fixed identities, where a qualitative mutation of the artistic continuum occurs. The developed theoretical paradigm allows for the creation of an effective methodology for interpreting contemporary texts that reflect the global crisis of the classical anthropological paradigm and the disintegration of metanarratives. The introduction of this category significantly modifies the methodological apparatus of theoretical poetics, ensuring a heuristic breakthrough in the research of the complex narrative dynamics of modern artistic systems.

**Key words:** liminality; initiation; transgression; contemporary literature; liminal chronotope; abjection; heterotopia; transformation; hyperreality; simulacrum; simulation; post-structuralism.
Ref.: 11 titles.

**Уводзіны.** У сучаснай гуманітарнай эпістэме назіраецца радыкальны зрух ад вывучэння статычных структур да аналізу дынамічных, няўстойлівых станаў. У гэтым кантэксце катэгорыя лімінальнасці (лац. limen парог) набыла статус універсальнага герменеўтычнага ключа, здольнага растлумачыць механізмы трансфармацыі як індывідуальнай свядомасці, так і сацыяльных сістэм. Калі класічная рацыянальнасць імкнулася да выразнай бінарнай апазіцыі (свой/чужы, жывы/мёртвы, сакральны/прафанны), то посткласічная парадыгма факусуецца на зонах неадрозненасці, размытасці і гібрыднасці.

Актуальнасць даследавання абумоўлена тым, што лімінальнасць перастала быць выключна антрапалагічным тэрмінам, які апісвае архаічныя рытуалы. Яна ператварылася на дыягназ эпохі. Сучасны суб'ект знаходзіцца ў стане перманентнага пераходу — паміж

© Цімашэнка А. В., 2026



Репозиторий БарГУ

сацыяльнымі статусамі, віртуальнай і фізічнай рэальнасцю. Дадзены артыкул ставіць на мэце дэканструкцыю ўнутранай архітэктонікі лімінальнасці, выяўленне гетэрагеннай прыроды дадзенага паняцця і аналіз яго рэпрэзентацыі ў сучасным філасофска-мастацкім і непасрэдна літаратуразнаўчым дыскурсе.

Асаблівую эўрыстычную значнасць у дадзеным кантэксце набывае канцэптуалізацыя лімінальнага хранатопа як спецыфічнай інтэрстыцыяльнай матрыцы мастацкага быцця. У сітуацыі эпістэмалагічнага крызісу традыцыйных прасторава-часавых мадэляў узнікае вострая патрэба ў дэфініцыі катэгорыі, здольнай апісаць стан анталагічнай прыпыненасці, дзе дыфузія межаў і трансгрэсія суб'ектнасці становяцца сістэмаўтваральнымі прынцыпамі паэтыкі. Тэарэтычнае абгрунтаванне лімінальнага хранатопа дазваляе адысці ад дэскрыптыўнага апісання «парогавых» локусаў і перайсці да аналізу фундаментальнай перабудовы мастацкага кантынууму, у якім часавае і прасторавае губляюць сваю дыскрэтнасць, набываючы статус універсальнай прасторы станаўлення. Такім чынам, рэпрэзентацыя дадзенага паняцця ў літаратуразнаўчым інструментарыі з'яўляецца неабходнай умовай для рэлевантнай інтэрпрэтацыі сучасных тэкстаў, якія фіксуюць распад класічнай антрапалагічнай парадыгмы.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыялам даследавання паслужыў масіў тэарэтыка-філасофскіх і літаратуразнаўчых канцэпцый, якія фарміруюць сучасную навуковую парадыгму вывучэння межавых станаў быцця і тэксту. У якасці крыніц выкарыстоўваліся фундаментальныя працы ў галіне структурнай антрапалогіі, постструктуралізму, фенаменалогіі і тэарэтычнай паэтыкі, што дазволіла прасачыць генезіс і мадыфікацыю паняцця лімінальнасці: ад рытуальна-міфалагічных мадэляў да ўніверсальных анталагічных метафар. Асаблівая ўвага нададзена інтэрдысцыплінарным сувязям, якія ўзнікаюць на стыку філасофіі і літаратуразнаўства пры аналізе крызісных станаў суб'екта і дэструкцыі наратыўных структур.

Метадалагічны апарат працы грунтуецца на прынцыпах сістэмнага і парадыгмальнага падыходаў. Ключавым метадам з'яўляецца тэарэтычнае мадэляванне, якое выкарыстоўваецца для эксплікацыі структуры «лімінальнага хранатопа» як аўтаномнай інтэрстыцыяльнай матрыцы мастацкага быцця. У працэсе даследавання быў прыменены кампаратыўна-эпістэмалагічны аналіз, які дазволіў супаставіць розныя інтэрпрэтацыйныя коды (саматычны, прасторавы, тэмпаральны) і выявіць іх ролю ў фарміраванні памежнага дыскурсу. Важнае месца ў працы займае герменеўтычная дэдукцыя, накіраваная на выяўленне логікі трансгрэсіўных працэсаў і стратэгій інгрэсіі (выхаду) суб'екта з лімінальнай зоны. Метад структурна-семіятычнай эксплікацыі дазволіў фармалізаваць паняцце «парога» не як кропкавага элемента сюжэта, а сістэмаўтваральнага прынцыпу арганізацыі мастацкага кантынууму. Выкарыстаны метадалагічны комплекс забяспечвае высокі ўзровень тэарэтычнага абагульнення і дазваляе сфармуляваць рэлевантную навуковую базу для далейшых прыкладных даследаванняў у галіне сучаснай паэтыкі.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Вытокі тэорыі лімінальнасці ляжаць у структурным функцыяналізме пачатку XX стагоддзя. Французскі этнограф Арнольд ван Генэп у фундаментальнай працы «Абрады пераходу» (1909) сфармуляваў трохчасткавую мадэль любой сацыяльнай трансфармацыі, якая складаецца з сепарацыі (аддзялення ад ранейшага сацыяльнага асяроддзя), лімінальнасці (уласна пераходу) і агрэгацыі (уключэння ў новы статус) [1, с. 21]. Для А. ван Генэпа лімінальнасць была, перадусім, тапалагічнай і часовай зонай — «нічыйнай зямлёй», неабходнай для таго, каб пазбегнуць сацыяльнага шоку пры змене статусу. Аднак сапраўдную філасофскую глыбіню гэтаму паняццю надаў брытанскі антраполаг Віктар Тэрнер. У сваіх даследаваннях (у прыватнасці, у працы «Рытуальны працэс») ён пераасэнсаваў лімінальнасць не як тэхнічную паўзу, а як стан радыкальнай «патэнцыяльнасці». Згодна з В. Тэрнерам, лімінальная фаза характарызуецца антыструктурай. Суб'ект тут не проста мяняе адно сацыяльнае адзенне на іншае — ён агаляецца да сутнасці. «Лімінальнасць, — піша Тэрнер, — гэта царства чыстай магчымасці, адкуль узнікаюць новыя канфігурацыі ідэй і адносін»[1] [2, с. 169]. Ключавой характарыстыкай гэтага стану з'яўляецца яго

[1] Тут і далей пераклад на беларускую мову наш — А. Ц.



Рэпазіторый БарДУ

амбівалентнасць. Лімінальная персона (неафіт) — «ні тое, ні сё» (betwixt and between). З аднаго боку, гэта стан максімальнай уразлівасці: неафіты пазбаўляюцца маёмасці, імёнаў, адзення, яны прыпадабняюцца да мёртвых або эмбрыёнаў. З іншага боку, менавіта ў гэтай кропцы «структурнай смерці» нараджаецца феномен communitas — спантаннай, неіерархічнай еднасці людзей, роўных перад абліччам свяшчэннага [2, с. 96].

Аднак калі ў архаічнай традыцыі гэты стан быў строга рэгламентаваны і завяршаўся вяртаннем у структуру, то ў мастацкай прасторы сучаснасці лімінальнасць набывае рысы ўмоўнай «бясконцасці без пачатку», дзе герой часта захрасае ў фазе пераходу. Адбываецца разбурэнне класічнага тэлеалагічнага вектара рытуалу: замест прадказальнага выніку ўзнікае прастора завіслай няпэўнасці. Тым не менш выхад з гэтага «бясконцага калідора» застаецца магчымым, хоць ён і губляе свой калектыўны, абрадавы характар. У каардынатах сучаснай прозы інгрэсія (выхад у новы статус) здзяйсняецца альбо праз радыкальную трансгрэсію — перасячэнне апошняй мяжы, якая не прадугледжвае вяртання, — альбо праз экзістэнцыяльны прарыў, дзе суб'ект здабывае новую ідэнтычнасць коштам поўнага разрыву з папярэдняй структурай быцця.

Прасторавая рэалізацыя лімінальнасці ў сучасным дыскурсе цесна карэлюе з канцэпцыяй гетэратопій, прапанаванай Мішэлем Фуко. Калі, напрыклад, утопія — месца, якога няма, то гетэратопія — рэальнае месца, якое функцыянуе паводле выключных правілаў, з'яўляючыся «контрмесцам», якое існуе ўнутры культуры, але адначасова «аспрэчвае і пераварочвае» яе [3, с. 195]. Бальніцы, псіхіятрычныя клінікі, турмы, дамы састарэлых, а ў кантэксце глабалізацыі — аэрапорты, вакзалы і гатэлі (тое, што Марк Ожэ назваў «не-месцамі» [4]) — усё гэта прасторы лімінальнага тыпу. У мастацкім тэксце хранатоп такіх локусаў мадэлюецца як зона анталагічнай непразрыстасці. Тут звыклыя прычынна-выніковыя сувязі скажаюцца, а прастора становіцца лабірынтападобнай, адлюстроўваючы заблытанасць свядомасці суб'екта.

Тэмпаральны аспект лімінальнасці не менш складаны. У рытуале час спыняецца або замыкаецца ў кола, вяртаючы ўдзельнікаў да міфічнага in illo tempore («у той час»), пра што пісаў Мірча Эліядэ [5, с. 48]. Гэта сакральны час, калі свет ствараўся нанова. Аднак у секулярным вымярэнні літаратурнага твора «спыненне часу» часта набывае трагічнае адценне. Гэта час экзістэнцыяльнай нуды (l'ennui), чакання (як у п'есах С. Бекета) або псіхатычнага правалу памяці. Лімінальны час — гэта заўсёды «паміж»: паміж успамінам і надзеяй, паміж траўмай мінулага і страхам будучыні. Суб'ект знаходзіцца ў кропцы нулявой падзеі, калі гісторыя больш не рухаецца, ператвараючыся ў статычны кашмар.

Асобнай увагі патрабуе цялеснае вымярэнне пераходу, якое мы вызначаем як саматычную (цялесную) лімінальнасць. У стане крызісу цела перастае быць маўклівым інструментам духу; яно заяўляе пра сябе праз боль, хваробу, метамарфозу. Тэарэтычным падмуркам для аналізу гэтага аспекту выступае канцэпцыя аб'екцыі (l'abjection), распрацаваная Юліяй Крысцевай у працы «Сілы жаху: эсэ пра адрынанне»: «Агіднае і агіда — тая агароджа, што ўтрымлівае мяне на краі. Апоры маёй культуры» [6, с. 37]. Аб'ект — тое, што выкідваецца прэч, каб суб'ект мог існаваць. Гэта мяжа «я», якая пастаянна парушаецца. Кроў, гной, ваніты, трупнае раскладанне — усе гэтыя праявы біялагічнага жыцця знаходзяцца ў лімінальнай зоне: яны ўжо не з'яўляюцца часткай суб'екта, але яшчэ не сталі аб'ектам знешняга свету. Саматычная (цялесная) лімінальнасць у літаратуры (напрыклад, у творчасці Ф. Кафкі, Ж. П. Сартра, С. Бэкета, К. Ісігура, К. Абэ і інш.) рэалізуецца праз вобразы мутацый, страты фізічных межаў, распадзення цялеснай абалонкі. Цела становіцца «пранікальным», яно губляе сваю цэласнасць, ператвараючыся ў поле бітвы паміж чалавечым і звярыным, жывым і нежывым. Гэта вопыт радыкальнага адчужэння ад уласнай фізіялогіі, калі «я» з жахам назірае за аўтаномным існаваннем уласнай плоці.

На вышэйшым узроўні абагульнення лімінальнасць супадае з паняццем «памежнай сітуацыі» (Grenzsituation) [7], уведзеным Карлам Ясперсам. Гэта сітуацыі (смерць, пакута, віна, барацьба), у якіх чалавек сутыкаецца з межамі свайго эмпірычнага існавання і выходзіць да трансцэндэнцыі. У адрозненне ад рытуальнага пераходу, які гарантуе бяспеку праз прытрымліванне канону, экзістэнцыяльная лімінальнасць — скачок у бездань без страхоўкі. Тут

Репозиторий БарГУ

дарэчы звярнуцца да катэгорыі нумінознага Рудольфа Ота. Сустрэча з «Абсалютна Іншым» (Mysterium Tremendum) заўсёды лімінальная па сваёй прыродзе. Яна выклікае horror et fascinans (жах і захапленне) [8]. У мастацкай літаратуры гэты аспект выяўляецца ў момантах епіфаній або духоўных катастроф герояў, калі звыклы свет логікі і рацыянальнасці рушыцца, саступаючы месца ірацыянальнаму вопыту. Метафізічная лімінальнасць — стан знаходжання на парозе Таямніцы, якая не паддаецца вербалізацыі, патрабуючы ад суб'екта поўнай трансфармацыі свядомасці.

Інтэграцыя тэорыі лімінальнасці з філасофіяй постмадэрнізму, у прыватнасці з ідэямі Жана Бадрыяра, адкрывае новыя далягляды даследавання. Французскі філосаф сцвярджае, што сучаснасць характарызуецца прэцэсіяй сімулякраў — знакаў, якія не маюць рэферэнтаў у рэальнасці [9]. У свеце татальнай сімуляцыі і «празрыстасці зла» ўзнікае пытанне: ці магчымая сапраўдная лімінальнасць там, дзе няма сапраўднай рэальнасці? Парадаксальным чынам менавіта ў эпоху постмадэрну ўвесь соцыум становіцца глабальна лімінальным. Знікненне вялікіх наратываў і ўстойлівых ідэнтычнасцей ператварае жыццё ў серыю бясконцых пераходаў. Аднак гэта ўжо не сакральны пераход да новага статусу, а блуканне ў лабірынце люстэркаў. Мастацтва ў гэтым кантэксце выступае як спроба стварэння штучных зон лімінальнасці — «разрываў» у тканіне сімуляцыі, дзе праз шок, абсурд або трансгрэсію чытач/глядач можа на імгненне адчуць дотык да Рэальнага (у лаканаўскім сэнсе) [10].

Для сучаснага літаратуразнаўства актуальнай задачай з'яўляецца дэталізацыя прасторава-часавых мадэляў, якія апісваюць крызісныя станы суб'екта. Намі ўводзіцца ў навуковы ўжытак паняцце «лімінальны хранатоп» у значэнні катэгорыі сучаснай паэтыкі, якая ўяўляе сабой аўтаномную інтэрстыцыяльную матрыцу мастацкага кантынууму, дзе традыцыйныя прасторава-часавыя каардынаты губляюць сваю дыскрэтную функцыянальнасць і трансфармуюцца ў зону перманентнай трансгрэсіі. У адрозненне ад класічных хранатопаў, лімінальны хранатоп фіксуе не статыку знаходжання, а дынаміку «парогавага» існавання. Фундаментам для вылучэння лімінальнага хранатопа служыць спадчына М. Бахціна, які ў сваёй працы «Формы часу і хранатопа ў рамане» вызначыў вобраз парога як прастору крызіса — метафарычную, звязаную з момантам пералому ў жыцці чалавека. М. Бахцін падкрэсліваў: «На парозе час становіцца імгненнем, якое нібыта не мае працягласці і выпадае з нармальнага цячэння біяграфічнага часу» [11, с. 397].

Аднак лімінальны хранатоп у нашым разуменні — значна больш шырокая катэгорыя. Калі ў Бахціна «парог» — кропкавы момант прыняцця рашэння, то лімінальны хранатоп у літаратуры XX—XXI стагоддзяў разрастаецца да фундаментальнай анталагічнай мадэлі мастацкай рэчаіснасці. Ён становіцца месцам, дзе персанаж можа знаходзіцца бясконца доўга, ператвараючы «імгненне» ў працяглае існаванне ў безчасоўі. Лімінальны хранатоп у сучаснай мастацкай літаратуры перастае быць толькі сюжэтным элементам пераходу (як у міфе або казцы) і становіцца сістэмаўтваральным прынцыпам пабудовы тэксту. Мастацкая мадэль свету ў такіх тэкстах грунтуецца на адмове ад тэлеалогіі. Герой больш не імкнецца выйсці з лімінальнага стану, а асвойвае яго як адзіна магчымую рэальнасць. Для аўтара лімінальны хранатоп з'яўляецца лабараторыяй сэнсаў, калі праз разбурэнне старых структур (сацыяльных, моўных, цялесных) адбываецца нараджэнне новых формаў ідэнтычнасці.

Варта канстатаваць, што нягледзячы на энтрапійны характар сучаснага лімінальнага хранатопа, інгрэсія (выхад на якасна новы ўзровень існавання) застаецца патэнцыйна магчымай. Аднак яна радыкальна адрозніваецца ад архаічнай ініцыяцыі: калі ў рытуале выхад быў калектыўна гарантаваным, то ў сучаснай тэарэтычнай парадыгме ён набывае статус экзістэнцыяльнай трансгрэсіі. Гэты прарыў ажыццяўляецца праз поўную дэструкцыю папярэдняй ідэнтычнасці і прыняцце стану нявызначанасці як новай кропкі зборкі суб'екта. Такім чынам, лімінальны хранатоп выступае не проста як замкнёны локус «захрасання», а як складаная інтэрстыцыяльная матрыца, у якой дыфузія межаў становіцца ўмовай для анталагічнага пераходу. У гэтым кантэксце лімінальны хранатоп характарызуецца асаблівай семіятычнай шчыльнасцю: ён трансфармуе лінейнае цячэнне часу ў прастору «нулявой падзеі», якая адначасова з'яўляецца кропкай максімальнай анталагічнай напружанасці. Выхад на новы ўзровень у такіх

Рэпазіторый БарДУ

каардынатах патрабуе ад героя не вяртання ў структуру, а здольнасці да існавання ў сітуацыі «адкрытага фіналу», дзе перамога над хаосам адбываецца праз яго поўную асіміляцыю ў структуру асобы.

Такім чынам, лімінальны хранатоп — гэта эўрыстычная мадэль інтэрпрэтацыі тэксту, якая дазваляе аналізаваць сучасныя мастацкія сістэмы не як апісанне знешняй рэальнасці, а як даследаванне складанай дынамікі памежных станаў свядомасці і быцця, дзе менавіта знаходжанне «на мяжы» становіцца адзіным спосабам анталагічнай рэалізацыі суб’екта.

**Заключэнне.** Падсумоўваючы праведзены аналіз, можна сцвярджаць, што лімінальнасць з’яўляецца складанай, шматвектарнай сістэмай, якая ахоплівае ўсе ўзроўні чалавечага быцця. Гэта не проста «стан паміж», а магутны генератар сэнсаў. Менавіта ў лімінальных зонах, дзе старыя нормы ўжо не дзейнічаюць, а новыя яшчэ не ўсталяваны, адбываюцца сапраўдная творчасць і самапазнанне. Дынамічную мадэль гэтага працэсу можна фармалізаваць як рух ад статыкі да дынамікі праз кропку біфуркацыі. Сучасная літаратура і філасофія, фіксуючы гэты стан, выконваюць тэрапеўтычную і гнасеалагічную функцыі: яны вучаць суб’екта існаваць ва ўмовах адсутнасці гарантый, ператвараючы пакуту нявызначанасці ў свабоду станаўлення. Такім чынам, катэгорыя лімінальнасці застаецца фундаментальным інструментам для разумення чалавечай прыроды ў эпоху глабальных трансфармацый. Увядзенне катэгорыі «лімінальны хранатоп» дазваляе больш глыбока аналізаваць мастацкія тэксты крызісных эпох, выяўляючы ў іх не проста хаос, а складаную структуру «парогавага» быцця, якое стала для сучаснага чалавека фундаментальнай умовай існавання.

Асаблівую навуковую значнасць мае выснова аб тым, што лімінальны хранатоп у сучаснай літаратурнай тэорыі перастае быць часовай фазай і набывае рысы перманентнай прасторавай і анталагічнай катэгорыі. Больш таго, магчымасць пераадолення лімінальнасці і выхаду на новы ўзровень быцця не адмяняецца, але мадыфікуецца: інгрэсія здзяйсняецца праз радыкальную трансгрэсію, якая змяняе саму прыроду суб’екта. Гэта дазваляе інтэрпрэтаваць лімінальны хранатоп як эўрыстычную мадэль, якая фіксуе не столькі фінальны распад, колькі працэс бесперапыннага станаўлення праз крызіс. Такім чынам, распрацаваная канцэпцыя забяспечвае метадалагічны падмурак для аналізу тых мастацкіх сістэм, дзе менавіта знаходжанне «на парозе» з’яўляецца адзінай крыніцай нараджэння новых сэнсавых канфігурацый.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Ван Геннеп, А.* Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов / А. ван Геннеп ; пер. с фр. Ю. В. Ивановой, Л. В. Покровской. — М. : Вост. лит., 1999. — 198 с.
2. *Тэрнер, В.* Ритуальный процесс. Структура и антиструктура / В. Тэрнер ; пер. с англ. Е. Д. Руткевич. — М. : Республика, 1999. — 272 с.
3. *Фуко, М.* Другие пространства / М. Фуко // Интеллектуалы и власть: избранные политические статьи, выступления и интервью / М. Фуко ; пер. с фр. И. Окуневой. — М. : Праксис, 2006. — Ч. 3. — С. 191—204.
4. *Оже, М.* Не-места. Введение в антропологию гипермодерна / М. Оже ; пер. с фр. А. Ю. Коннова. — М. : Новое литератур. обозрение, 2017. — 136 с.
5. *Элиаде, М.* Священное и мирское / М. Элиаде ; пер. с фр. Н. К. Гарбовского. — М. : Изд-во МГУ, 1994. — 144 с.
6. *Кристева, Ю.* Силы ужаса: эссе об отвращении / Ю. Кристева ; пер. с фр. А. Костиковой. — СПб. : Алетейя, 2003. — 256 с.
7. *Ясперс, К.* Введение в философию / К. Ясперс ; пер. с нем. А. А. Михайлова. — М. : Прогресс, 2000. — 192 с.
8. *Отто, Р.* Священное. Об иррациональном в идее божественного и его соотношении с рациональным / Р. Отто ; пер. с нем. А. М. Руткевича. — СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2008. — 272 с.
9. *Бодрийяр, Ж.* Симулякры и симуляция / Ж. Бодрийяр ; пер. с фр. А. Качалова. — М. : Постгум, 2015. — 240 с.
10. *Лакан, Ж.* Семинары. Книга 11: Четыре основные понятия психоанализа (1964) / Ж. Лакан ; пер. с фр. А. Черноглазова. — М. : Гнозис/Логос, 2004. — 304 с.
11. *Бахтин, М. М.* Формы времени и хронотопа в романе. Очерки по исторической поэтике / М. М. Бахтин // Вопросы литературы и эстетики. — М. : Худож. лит., 1975. — С. 234—407.


Поступила в редакцию 08.06.2026.

Репозиторий БарГУ